**Сакалоўская, І.** Радавы на вайне, герой у жыцці / І. Сакалоўская // Витебские вести. — 2014. — 6 февр. — С. 3.

**РАДАВЫ НА ВАЙНЕ, ГЕРОЙ У ЖЫЦЦІ**



Віктар Бурэль у Афганістане быў старшым гранатамётчыкам. Калі дамаўлялася з ім аб сустрэчы, ён сціпла сказаў па тэлефоне: «Што пра мяне пісаць, я ж не герой вайны...». Аднак прыходзіць час, калі пішуць менавіта пра радавых. Старшыня Браслаўскай раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Леанід Мікшта называе Віктара Бурэля сучасным героем, бо той адзін выхоўвае чацвярых дзяцей.

«Афганец» і шматдзетны бацька жыве ў Друі. Мой шлях у памежны аграгарадок у дваццаціградусны мароз быў нялёгкім. Віктар павінен быў сустрэць мяне, але я памылкова выйшла на прыпынак раней. Таму першай адбылася сустрэча з яго сярэднім сынам Арцёмам, прыгожым хлопцам у форме, які вяртаўся на канікулы да бацькі з Мінска, дзе вучыцца ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце на ваеннага ўрача. Два малодшыя хлопчыкі яшчэ спалі: першакласнік Антон і трохгадовы Дзіма. Апошняму было два месяцы, калі маці захварэла, і з бутэлечкі малаком яго карміў ужо бацька. Старэйшага сына Захара я дома не застала, ён быў на сесіі ў Мазыры.

Сям’я Віктара Бурэля цудоўная: пяць сапраўдных мужчын. Вось толькі жанчыны не хапае. Шматдзетны бацька з вайсковай загартоўкай прывучае быць моцнымі духам і хлопцаў. Часам дапамагае маці Віктара – Вера Захараўна, былая вязніца канцлагера ў Саласпілсе, яна працуе ў друйскай бальніцы сястрынскага догляду.

Пакуль Віктар адлучаецца па гаспадарчых справах, пытаюся ў ягоных хлопцаў, ці расказвае бацька пра Афганістан. Яны кіўком сцвярджаюць – так. Першакласнік Антон пачынае аповед... Вяртаецца Віктар, і мы ўжо па-сур’ёзнаму гутарым пра афганскія падзеі.

У армію яго забралі з першага курса Наваполацкага політэхнічнага інстытута, напачатку была «вучэбка» на аператара-наводчыка БМП-2 у літоўскім Гайжунаі, на той час найбуйнешым

вучэбным цэнтры паветрана-дэсантных войск. Як потым аказалася, у тым жа палку афіцэрам служыў будучы выхавацель сына Арцёма ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы Павел Назараў.

Служыў у Афганістане ў 1986–1987 гадах. Іншых хлопцаў з «вучэбкі» пакінулі ў палках віцебскай дывізіі ў Кабуле. Яго і яшчэ траіх таварышаў з Беларусі – Ігара Буракоўскага, Уладзіміра Дуранкова і Вячаслава Матэцкага – адправілі на Баграмскі аэрадром, дзе дыслацыраваўся 345-ы асобны парашутна-дэсантны полк, камандзірам якога быў Герой Савецкага Саюза Валерый Вастроцін – легендарная для дэсантнікаў асоба. Менавіта пра іх полк зняты вядомы фільм Ф. Бандарчука «9-я рота».

Першы паход «на вайну» Віктара Бурэля быў да пакістанскай граніцы, мясцовасць Аліхейль. Пяхота сышла ў горы, а яны засталіся на «бранi», перад імі ехалі два БТР. Іх і падарвалі. Тады ўжо не ў кіно пабачыў, як паліва гарыць на вадзе. Гэта стала першым баявым хрышчэннем.

Пасля некалькіх месяцаў службы прыйшла дрэнная навіна з радзімы – памёр бацька. Адпусцілі на пахаванне. Воляй лёсу менавіта гэта выратавала яму жыццё. Пакуль быў дома, машына, на якой звычайна ездзіў, падарвалася, вадзіцель цудам застаўся жывы, толькі пасекла пальцы. Тады Віктар падумаў пра таварыша: «Відаць, за яго нехта моцна маліўся».

Потым былі палявы і кабульскі шпіталі, паўжывы ляжаў з ліхарадкай, але хвароба адышла. Пасля служба працягнулася: засады ў гарах, падстрахоўкі калон, абстрэлы душманаў. Вайна дала каштоўны вопыт і загартоўку: Віктар Бурэль ганарыцца тым, што вытрымаў яе і не здаў фізічна і маральна, як кажуць байцы, «не здох». Гэта потым дапамагло быць мужным у жыццёвых абставінах, чаму навучыў старэйшых дзяцей і вучыць цяпер малодшых. З нягодамі спраўляецца сам, не просячы дапамогі. Ён прытрымліваецца пазіцыі: чалавек заўсёды павінен заставацца чалавекам, не быць слізкім, подлым, зайздрослівым. У Афгане Віктар бачыў усякіх і цяпер з упэўненасцю кажа, што многае залежыць ад сям’і, дрэнныя якасці людзей часта нараджаюцца менавіта там.

Моцным трэба быць і фізічна. Так выжывалі ў 1990-я толькі дзякуючы цяжкай працы. Каб зарабіць на сям’ю, прыходзілася касіць з шасці ранку да адзінаццаці вечара, начаваць у полі без сіл на возе. Ратавала дамашняя гаспадарка. Цяпер ён узімку качагар у мясцовай СШ, а ўлетку – вартаўнік, таксама падпрацоўвае ў ААТ «Друйскі».

Род Бурэляў сялянскі, дзед Мечыслаў быў аратым. Менавіта ягонае выхаванне Віктар узгадвае цёплымі словамі, ён і прывіў свайму ўнуку любоў да сям’і. Цяпер старэйшы сын Захар працуе выхавацелем ў Друйскім дзіцячым доме, а сам Віктар з удзячнасцю кажа пра педагогаў Віцебскага кадэцкага вучылішча, дзе атрымоўваў вайсковую адукацыю Арцём, – падпалкоўнікаў паветрана-дэсантных войск у адстаўцы Вячаслава Паўловіча і Паўла Назарава, настаўніка хіміі Руслана Шклейніка.

У 90-я гады сябра неяк запытаў Віктара, як ён уяўляе сабе жыццё, калі яму будзе 40. Тады той нічога не адказаў. За гэты час пайшлі з жыцця многія сябры і знаёмыя, цяжка захварэла жонка. Аднак нягледзячы на страты і боль Віктар Бурэль кажа, што шчаслівы, бо ён – бацька чатырох добрых хлопцаў.

**І. Сакалоўская**